Жыллё маё

# ПРЫГАЖОСЦЬ І ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ

## у стварэнні сучаснага асяроддзя гарадоў і вёсак Беларусі

**Комплексныя падыходы да стварэння добраўпарадкаванага якаснага жылля заключаюцца сёння ў добраўпарадкаваных і бяспечных дзіцячых пляцоўках, забяспечанасці жыхароў машынамесцамі, закрытых ад чужых двароў, развітой інфраструктуры ў крокавай даступнасці, стварэнні безбар'ернага асяроддзя. Такімі бачаць спецыялісты камфортнае асяроддзе беларускіх гарадоў. Пра кансервацыю смеццеправодаў, велапаркоўкі і велагаражы, безбар'ернае асяроддзе і іншае, што робіцца ў краіне, каб беларусы жылі ў камфортных, прыгожых і ўтульных мястэчках, расказалі эксперты.**

### КОМПЛЕКСНАСЦЬ І ЭСТЭТЫКА

Заканадаўства, якое датычыцца галіны архітэктурнай горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, скіравана найперш на паляпшэнне комплекснага добраўпарадкавання эстэтычнага аблічча населеных пунктаў, даступнасць, якасць і камфорт асяроддзя, запэўніла **Таццяна ГАЎРЫЛЕНКАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення архітэктуры, горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай, інавацыйнай палітыкі і лічбавай трансфармацыі Мінбудархітэктуры:**

— Пастановай № 81 Мінбудархітэктуры зацверджаны і ўведзены з 2 мая 2021-га будаўнічыя нормы «Асяроддзе пражывання для фізічна аслабленых асоб». Гэтым дакументам вызначаюцца абавязковыя патрабаванні да стварэння даступнага асяроддзя для жыццядзейнасці такіх асоб. Адступленне ад іх дазваляецца толькі ў рэдкім выпадку. А тэхнічны кодэкс устаноўленай практыкі адносна безбар'ернага асяроддзя — дакумент, які рыхтаваўся сумесна з пажаданнямі грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў. Безбар'ернае асяроддзе павінна быць комплексным, незалежна ад таго, вуліца гэта, жылы або адміністрацыйны будынак.

Штогод у краіне праходзіць рэспубліканскі аглядны конкурс санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў і аграгарадкоў. Шмат вёсак і мястэчак былі добраўпарадкаваны таксама ў межах Года малой радзімы. Падчас падвядзення вынікаў журы ацэньвае комплекснасць мерапрыемстваў і завершанасць аб'ектаў добраўпарадкавання, укараненне новых тэхналогій, у тым ліку светлавой рэкламы.

Спецыялісты Мінбудархітэктуры адзначаюць у гарадах і пасёлках краіны мэтанакіраваную работу па комплесным добраўпарадкаванні, галоўным вынікам якой стала стварэнне выразных архітэктурных ансамбляў грамадскіх цэнтраў, культурна-бытавых і гандлёвых будынкаў, уладкаванне мемарыяльных комплексаў і іншае.



### СТАЛІЧНЫЯ ДВАРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ІНВАЛІДАЎ

У сталіцы сёлета запланаваны капітальны рамонт 25 прыдомавых тэрыторый, дзве з якіх ужо ўпарадкаваны, а на дзесяці цяпер вядуцца работы. Асноўныя кірункі працы пры гэтым — рамонт і замена дзіцячага гульнёвага і спартыўнага абсталявання, рамонт пешаходных сувязяў і абсталяванне новых там, дзе найчасцей ходзяць людзі, рамонт прыдваровых пад'ездаў, вонкавых лесвіц і падпорных сценак, замена малых архітэктурных формаў (МАФ), азеляненне, расказала **Настасся ВАРАБ'ЁВА, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду і рабоце з насельніцтвам Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

— Адрамантавана 1200 $м^2$ асфальтавага пакрыцця і амаль чатыры тысячы пагонных метраў бартавога каменю, усталявана 3915 $м^2$ пліткавага пакрыцця, усталявана 23 адзінкі дзіцячага гульнявога і спартыўнага абсталявання, заменена 44 МАФ, абсталяваны дзве сучасныя кантэйнерныя пляцоўкі, зроблена вонкавае асвятленне на дзвюх дваровых тэрыторыях.

У межах бягучага рамонту ў Мінску сёлета набудуць прывабны выгляд 723 двары. Сёння ўжо адрамантаваны 534 такія тэрыторыі. Адрамантавана, у прыватнасці, 182 тысячы $м^2$ дваравых праездаў. У 86 дварах у межах арганізацыі безбар'ернага асяроддзя выканана паніжэнне бартавога каменю, у 25 дварах зроблена 29 паркавачных месцаў для інвалідаў.

У сталіцы працягваецца кансервацыя смеццеправодаў у шматкватэрных дамах. З гэтай мэтай летась у дварах Мінска ўстаноўлена 389 модульных канструкцый для раздзельнага збору цвёрдых камунальных адходаў. Сёння ва ўсіх дамах, дзе яшчэ функцыянуюць смеццеправоды, збіраюцца подпісы жыхароў адносна згоды на кансервацыю. Для пачатку работ дастаткова простай большасці ўласнікаў, заўважыла Настасся Вараб'ёва.

Сёлета ў дварах Мінска з'явілася таксама дзве велапаркоўкі на дзесяць месцаў і велагараж на 40 веламесцаў. Практычна ўся праектная дакументацыя па капрамонце двароў на 2021-ы прадугледжвае стварэнне велагаражоў.

А вось уладальнікі аўто могуць выступіць з прапановамі па арганізацыі дадатковых месцаў паркоўкі і паўдзельнічаць у іх стварэнні фінансава. У дварах, дзе кіроўцы паркуюцца на зялёных зонах, ствараюцца для гэтага перашкоды, дадала прадстаўніца Мінскай жыллёвай гаспадаркі.

— Найчасцей у месцах такіх парковак высаджваюцца кусты. Гэта і азеляняе двор, і памяншае колькасць паркавачных слупкоў і паўсфер. З боку жыллёвай забудоўлі стараемся не ўстанаўліваць такія формы, тым больш што правіламі дарожнага руху паркоўка ў такіх месцах забаронена. Тут акцэнт у рабоце з парушальнікамі робім на рэйдавыя абследаванні сумесна з Дзяржаўтаінспекцыяй.

Праектнымі нормамі, дарэчы, прадугледжана, што каля дома можа захоўвацца не больш за 25 % асабістага транспарту. Усе астатнія аўто павінны быць у паркінгах. Аднак, на жаль, апошнія сёння пустыя, і гэта ўжо пытанне нашага менталітэту, дадала Таццяна Гаўрыленкава.

### ПЛЯЖЫ, ДАРОГІ І СМЕЦЦЕ МІНШЧЫНЫ

Добраўпарадкаванне населеных пунктаў адбываецца згодна з дзяржпраграмай «Камфортнае жыллё», якая сёлета перазацверджана на 2021—2025 гг. Згодна з ёй, летась на Міншчыне было запланавана добраўпарадкаваць 118 прыдомавых тэрыторый, аднак выканалі работы амаль на 500. У выніку сёлета замест запланаваных да навядзення парадку 86 двароў набудзе новы выгляд значна больш, заўважыў **Арцём ЛАБКО, першы намеснік генеральнага дырэктара жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінскай вобласці.**

Грамадзяне таксама маюць права далучыцца грашыма да правядзення бюджэтных работ у дварах. У Смалявіцкім раёне, напрыклад, летась так устанавілі дзве дзіцячыя пляцоўкі. А ў Барысаўскім, Мінскім, Слуцкім і Вілейскім раёнах да арганізацыі 17 дзіцячых пляцовак далучыліся спонсары — юрыдычныя асобы, падкрэсліў ён.

На Міншчыне ў абслугоўванні прадпрыемстваў ЖКГ амаль 12 тысяч кіламетраў дарог і тры мільёны $м^3$ пешаходных сувязяў. Сёлета адрамантавана 46 тысяч $м^2$ асфальтавага пакрыцця, прагрэйдзіравана пасля зімы чатыры тысячы кіламетраў гравійных дарог. А з трох тысяч пешаходных пераходаў амаль 1,5 тысячы летась былі адаптаваны пад выкарыстанне фізічна аслабленымі асобамі, як і 606 тратуараў і 257 прыпыначных пунктаў.

Летась у вобласці пасадзілі каля 73 тысяч дрэў і 80 тысяч кустоў. Добраўпарадкаваны 134 паркі і скверы, акультураны 33 водна-рэкрэацыйныя зоны: пастаўлена шэсць спартыўных пляцовак, 13 адзінак дзіцячага абсталявання, чатыры грамадскія прыбіральні і 30 кабінак для пераадзявання.

А ўжо сёлета да пачатку купальнага сезона на Міншчыне добраўпарадкавалі яшчэ 32 водныя зоны, дзе ўсталявалі 19 дзіцячых і 29 спартыўных пляцовак, 47 прыбіральняў і прывялі ў парадак 102 кабінкі для пераадзявання.

Летась, дарэчы, ахоп раздзельным зборам смецця жыхароў Міншчыны склаў 100 %. Уласнікам прыватных сядзіб раздалі 65,5 тысячы кантэйнераў аб'ёмам 120 і 240 літраў. Сёлета плануюць набыць і распаўсюдзіць крыху больш за 58 тысяч кантэйнераў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Кніжная паліца

# НАРОД СКАЗАЎ:

## Кітайскі вопыт прачытання гістарычнай мудрасці




«Якім чынам можна падзяліцца з шырокім колам чытачоў вытанчанай глыбокай мудрасцю па кіраванні дзяржавай, выкладзенай у старажытных кітайскіх кнігах? Якім чынам можна жыва і выразна паказаць яе свету? Для гэтага варта шукаць неабходныя словы. У маі 2014 года пад кіраўніцтвам галоўнага рэдактара выдання «Жэньмінь жыбаа» Чжан Дэсю некалькі маладых людзей арганізавалі рэдакцыйную групу. Ян Кай, Чэнь Чжэнькай, Чжан Юаньцін узначалілі групу і займаліся планаваннем. Шэнь Мэнчжэ, Лю Шаахуа ўдзельнічалі ў працы па даследаванні і каментаванні, аналізавалі старажытныя кітайскія класічныя кнігі, упарадкавалі больш за 140 старажытных выслоўяў і афарызмаў, якія досыць часта выкарыстоўваліся, а затым падзялілі іх у адпаведнасці са старажытнай кітайскай логікай кіравання на наступныя шэсць частак: аб самаўдасканаленні, аб навучанні, аб народзе, аб маральнасці чыноўніка, аб кіраванні, аб Паднябеснай», — так тлумачыць канцэпцыю кнігі «Кітайская мудрасць класічнага кіравання», якая выйшла і на беларускай мове ў мінскім выдавецтве «Восточная культура», укладальнік замежнага выдання «Жэньмінь жыбаа». Пераклад з кітайскай мовы А. У. Гардзей.

Звернемся да аднаго з раздзелаў — «Аб навучанні». Гэта другая па ліку глава выдання. Што, дарэчы, падкрэслівае асаблівую значнасць пытання ў выкладанні тэмы ў звязку з кіраваннем. І да месца тут зварот да наступнага выказвання Сюнь-цзы: «Вучоны неабавязкова павінен быць чыноўнікам, але чыноўнік абавязкова павінен быць вучоным...». «Вучыцца і не разважаць — дарма губляць час, разважаць і не вучыцца — пагібельна» (з кнігі «Лунь юй»). «Наша жыццё мае мяжу, у ведаў мяжы няма» («Чжуан-цзы»). «Вучоба можа паглыбіць талент чалавека, як тачыльны камень робіць нож вастрэйшым» («Сховішча ведаў»). «Прачытаць дзесяць тысяч кніг, прайсці дзесяць тысяч лі» («Нататкі з кабінета жывапісу і медытацыі»). «Памылка ў адным іерогліфе можа сапсаваць увесь сказ. Памылка ў адным сказе можа сапсаваць усё сачыненне» («Кароткае кіраўніцтва для адрознення службовых слоў»). «Навучанне — гэта арбалет, а здольнасці — страла» («Прыналежнасць да катэгорыі вершаў») ...Укладальнікі падрабязна тлумачаць кітайскае прачытанне гэтых старажытных выслоўяў, што таксама вельмі істотна.

Можна павіншаваць не толькі «Восточную культуру», але і беларускага чытача з нараджэннем такога адметнага выдання. Несумненна, «Кітайская мудрасць класічнага кіравання» будзе запатрабавана. І не толькі даследчыкамі кітайскай культуры ў Беларусі, але і ўсімі, хто імкнецца да набыцця шырокага кіраўніцкага досведу. Зазірніце на старонкі выдання — і вы адкрыеце для сябе шмат старажытнасцю выпеставанай мудрасці, якая запатрабавана і сёння.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Перад выбарам

# ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ — РАДЗІМУ АБАРАНЯЦЬ

**Сённяшняя моладзь (не скажу, што ўся...) досыць дзіўна выбірае прафесіі: здае тэсты, набірае балы і потым, у залежнасці ад таго, колькі іх, вызначаецца з навучальнай установай, са справай, якой, любячы альбо не вельмі, будзе займацца ўсё жыццё. У бацькоў ды іхніх дзядоў усё іначай было.**

...Вайна для майго школьнага таварыша Лёні Кандраценкава пачалася з бамбёжкі, з таго, што маці, палажыўшы дзяцей да сценкі, затуліла, закрыла іх сабой.

Дзякаваць богу, яны тады ўцалелі, а вось суседка і яе сынок былі цяжка паранены, абое заліваліся крывёй, і малы аж заходзіўся крыкам: «Мама, коф, коф!».

А таму не дзіва, што, спалохаўшыся першай бамбёжкі, людзі сталі ўцякаць з горада. Лёнева маці таксама схапіла дакументы, што-нішто з ежы і рушыла прэч. Самае маленькае з дзяцей яна несла на руках і ўвесь час азіралася, каб не згубіць старэйшых...

Гэтай сям'і зноў пашчасціла: калі выйшлі на шашу, яе падабрала машына з ваеннай калоны, якая ў бок Смаленска везла аўтамабільныя колы. Сярод іх пасажыры і размясціліся, нейкі час спакойна праехалі. А калі пачаўся чарговы налёт, пасаскоквалі з машын, кінуліся бегчы ад дарогі. І ўжо на нейкай адлегласці маці ўбачыла, што яе дзяўчынкі побач, пры ёй, а вось хлопчыка, Лёні, няма, ён застаўся ў кузаве.

Маці рвалася пабегчы назад, але шафёр не пусціў яе: сказаў, што прападзе за нішто: нічым не дапаможа сыну і сіротамі пакіне дачок.

Усё было так і не так. Калі скончыўся налёт і Лёневы родныя вярнуліся ў машыну, то ўбачылі, што малы, змарыўшыся, соладка спіць.

У тым заклятым 41-м ён бачыў, што самалёты з чорнымі крыжамі беспакарана кружаць над натоўпам бежанцаў, бамбяць і страляюць па іх, а вось нашых самалётаў — з чырвонымі зоркамі — нідзе не відаць.

Тады ж ён упершыню адчуў, як гэта цяжка — быць бездапаможным, і вырашыў, што, калі выжыве, будзе абараняць людзей, стане ваенным лётчыкам.

Так яно ўрэшце і выйшла: ён атрымаў гэтую прафесію і званне палкоўніка (цяпер, праўда, у адстаўцы), амаль усё жыццё праслужыў у паветраных войсках Беларускай ваеннай акругі.

**Леанід ЕМЯЛЬЯНАЎ,**
*г. Мінск.*

Свой погляд

# «Каб размаўляць па-беларуску, трэба любіць гэтую мову...»

**Чытаць я вучыўся з дапамогай рускага буквара. Дома лічылі, што так будзе лепш, што гэтая мова ў жыцці мне болей патрэбная.**
**А вось школа была беларуская, і ніякіх цяжкасцей я там не адчуў, хіба зрэдку пісаў з памылкамі ды з лішнімі мяккімі знакамі.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усе прадметы ў нас выкладаліся па-беларуску, праўда, недзе ў пачатку шасцідзясятых у школу сталі прыходзіць маладыя настаўніцы і весці ўрокі па-руску.

І яшчэ я помню, што ўвосень 1962-га мы, тады васьмікласнікі, на месяц з'ездзілі ў калгас на ўборку яблыкаў, зарабілі нейкія грошы. За іх нам прапанавалі аформіць падпіску на маладзёжныя выданні, якія потым сталі прыносіць у школу. Такім чынам, хто што выпісаў, бачылі ўсе: камсорг класа атрымліваў «Комсомольскую правду», чатыры чалавекі (з сарака), у тым ліку і я, — «Чырвоную змену», астатнія — «Физкультурник Белоруссии» (ён менш каштаваў) і «Знамя юности»...

Большасць, як бачыце, выбірала рускамоўныя газеты. Думаю, не з-за таго, што родную любілі менш, проста з рускай і ўжо тады адкрывалася больш магчымасцяў для далейшай адукацыі, для гарадскога, а таму багацейшага і лягчэйшага жыцця.

...Сярэднюю спецыяльную адукацыю я атрымліваў у Расіі і зноў жа ніякіх моўных цяжкасцяў там не меў, хіба што аднойчы насмяшыў сяброўку, ужыўшы слова «сабака» ў мужчынскім родзе. А ў Гомель прыехаў пасля службы ў войску. Горад размаўляў па-руску. На гэтай жа мове вялася дакументацыя на нашым хімічным заводзе. Але ж у тыя часы яшчэ хапала астраўкоў беларускасці: на роднай мове друкавалася шмат газет, працавала радыё, па-беларуску я рабіў асабістыя запісы, пісаў і атрымліваў пісьмы ад беларусаў.

...З тых часоў многае змянілася. Мая беларуская нароўні з рускай атрымала статус дзяржаўнай, прычым першай з іх, але...

Па тэлебачанні штогод паказваюць інтэлектуальныя спаборніцтвы школьнікаў 5—11 класаў «Я знаю», і мне ў час праглядаў проста да болю крыўдна бачыць, як асобныя прадстаўнікі нашай школьнай эліты адказваюць на пытанні, зададзеныя па-беларуску і бывае, нават трох слоў звязаць не могуць!

Што, дарэчы, цалкам зразумела, бо, каб размаўляць па-беларуску, трэба любіць гэтую мову, а каб любіць, трэба чуць яе і бачыць: на вуліцы, па тэлебачанні, на шыльдах, на этыкетках і ўпакоўках прадуктаў харчавання.

Дарэчы, у нашых гомельскіх крамах бываюць украінскія тавары, якія падпісаны па-ўкраінску. І мы ж купляем іх, не бяжым шукаць перакладчыка. Вось і ўбачыўшы на ўпакоўцы словы «цукар», «воцат», «вяршкі», «гарэлка», «марозіва», думаю, зразумеем, што там знаходзіцца. Адпаведна, нашы дзеці ды ўнукі будуць разумець...

...Час ад часу я ўспамінаю эпізод з аповесці Васіля Быкава «Сцюжа». Перакажу яго сваімі словамі. Так званага нацдэма накіравалі на перавыхаванне ў працоўны калектыў, і ў ім жа праз нейкі час правялі сход з абмеркаваннем вынікаў, дзе адзін з рабочых (трэба разумець, «выхавальнікаў») спытаў у «выхаванца», чаму ён размаўляе па-беларуску. Той здзівіўся гэтаму пытанню, бо той, хто яго задаваў, таксама ж гаварыў па-беларуску... І патлумачыў потым, чаму: я, маўляў, непісьменны, мне — можна...

У сучасных рэаліях уменне свабодна размаўляць і чытаць на роднай і першай з дзяржаўных — прыкмета якраз адукаванасці, патрыятызму, культуры. І таму ў справе адраджэння мовы найбольшыя надзеі на нашу інтэлігенцыю. Я не русафоб, не ўхваляю некаторых краін, якія спрабуюць забараніць ужыванне рускай. На мой погляд, гвалтам ды забаронай нічога добрага тут не зробіш. Гісторыя ўжо адказала на прымусовую калектывізацыю, вырошчванне кукурузы там, дзе яна не расла, на барацьбу з п'янствам...

І, тым не менш, нельга аддаваць мову на волю лёсу. Ну сапраўды, не кідаем жа мы бацькоў, якія далі жыццё і вырасцілі нас — паставілі на ногі?

**Мікалай СТАРЫХ,**
*г. Гомель.*

Любі сваё

# Каму пляж, а каму і «сталоўка»

**Чым адрозніваецца пляж трэцяга Лідскага возера ад іншых вадаёмаў? Магу пералічыць: неверагодна спадзістым пясчаным берагам, празрыстай і цяпер надзвычай цёплай вадой, з якой ну ніяк не хочацца вылазіць на бераг, і парай лебедзяў.**

Скажаце, што для заходняй Беларусі гэтыя птушкі не ў навіну? Так, але ж не ўсе яны гэткія смелыя.

Маша з Пашам (як іх празвалі) не проста жывуць на трэцім Лідскім, — яны пачуваюцца тут сваімі: досыць ахвотна падплываюць да людзей на беразе, «пазіруюць», частуюцца... Што здзіўляе — усёй сям'ёй...

Асабіста я назірала гэтую карціну і летась, і сёлета. Першым — нібы ў разведку — падплывала дарослая асобіна, пераконвалася ў тым, што небяспекі няма, і тады ўжо вярталася з вывадкам шэрых малых.

— Каб падсілкавацца, гэта сямейства прыплывае на пляж гады з тры ўжо, — расказваў матрос-ратавальнік Віталь Афонін. — Хачу папярэдзіць, што набліжацца да птушак (асабліва калі побач вывадак) досыць небяспечна: можна спазнаць сілу моцнай дзюбы ды магутных крылаў...

Не рэкамендуюць прыкормліваць лебедзяў і арнітолагі, бо з часам птушкі могуць страціць свае прыродныя інстынкты — развучацца здабываць корм і з надыходам халадоў сутыкнуцца з сур'ёзнымі праблемамі.

А вось фатаграфавацца на фоне сямейства можна. Прыгожыя выходзяць кадры!

**Лілія ЛЯЎКОВІЧ,**
*г. Ліда.*



На чужых памылках

# «ГЭТА НЕ ПА-ЛЮДСКУ — ЖЫЦЬ ЗА ВЫСОКІМ ПЛОТАМ...»

**Не ведаю, як вам, а мне дык падабаецца сённяшняя мода. Людзі ходзяць ледзь не босымі, дзяўчаты і жанчыны — у светлых сукенках ды спадніцах, у лёгкіх шортах і штоніках. Гэта досыць прыгожа і ў спёку зручна, да таго ж, відаць, нічога не каштуе.**

Надоечы мы з госцяй-унучкай перабралі, напрыклад, старыя рэчы і чаго там толькі не знайшлі! Паўдня прасядзеўшы за швейнай машынкай, прыбралі дзяўчыну, можна сказаць, з ног да галавы: вярнулі да жыцця старыя матуліны джынсы і камізэлькі, дзве спадніцы, сарафан, а заадно я паказала ўнучцы, як рабіць брыджыкі, як можна (і модна!) падлатаць дзіркі на каленях...

Аднак пішу я пра гэта зусім не для таго, каб пахваліцца сабой, а якраз наадварот. Гадоў пятнаццаць таму ў нас узнікла патрэба памяняць агароджу вакол дома. Зяць сказаў, што выгадна зрабіць яе з бетонных пліт: адзін раз паставіць і забыцца. Я тады катэгарычна адмовілася, бо не хацела жыць як на могілках... «Ну тады давайце з металу зробім, — прапанаваў зяць. — Будзе дорага, але модна і прыгожа».

Я гэтую «прыгажосць» тады дрэнна ўяўляла, бо ў нашай вёсцы нічога падобнага яшчэ не было, і таму неяк лёгка згадзілася: са спакойнай душой паехала ў санаторый. А калі вярнулася і ўбачыла сваю сялібу, з тыдзень не магла супакоіцца! І тады, і цяпер па-ранейшаму думаю, што гэта не па-людску — адгароджвацца, хавацца ад іншых, жыць за высокім плотам, не бачыць (хіба ў шчылінку?), што робіцца на вуліцы, хто там ідзе і едзе...

Зяць суцяшаў — даводзіў, што сама цяпер магу не садзіць свае кветкі, не палоць грады, хадзіць галяком...

І тым самым яшчэ больш нерваваў, бо атрымлівалася, што высокі плот — гэта выбар дрэнных гаспадароў і гаспадынь, розных гультаёў ды неахайнікаў. А я ж заўсёды старалася, каб вакол дома ўсё акуратна і прыгожа было, каб радавала вочы — і не толькі мае...

На жаль, справа зроблена, грошы патрачаны. Як — ды хай Бог сцеражэ!.. Але ж я жыву, жыву ў трывозе за іншых, бо многія цяпер, разбураючы старыя платы, ставяць новыя — высокія, глухія, за якімі, як мне здаецца, добра толькі злодзеям. А што — неяк пералез (ці перамахнуў) і рабі што хочаш: ніхто нічога не ўбачыць, нікому не скажа, міліцыю не выкліча...

І яшчэ адзін мінус: за такім вось высокім плотам (да таго ж з замком на варотах) адзін знаёмы дзядуля жыў. Вечарам яму дрэнна стала, — выклікаў дзяцей і «хуткую»... Пакуль прыехалі ды адамкнулі замкі...

Вывад, як той казаў, зрабіце самі.

**Алена С.,**
*Барысаўскі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**